Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 20. Варыянт 5**

**Білет №20.Практычнае заданне. Развіццё культуры на беларускіх землях у XIV–XVIII стст.**

**Заданні склала:**настаўнік Міхальчанка А.І., ДУА «Мядзельская сярэдняя школа»

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

**1.**Адкуль на беларускія землі прыйшла ідэя будаўніцтва замкаў-кастэляў?
2. Абапіраючыся на тэкст дакумента, назавіце рысы замкаў-кастэляў і абярыце з прапанаваных на ілюстрацыях тыя замкі, якія можна аднесці да гэтага тыпу.
3. Знайдзіце на карце месцазнаходжанне гэтых замкаў і растлумачце, чым было абумоўлена будаўніцтва такіх замкаў менавіта на гэтай частцы тэрыторыі Беларусі.
4. Здагадайцеся, помнік якому князю быў устаноўлены ў г. Ліда ў 2019 годзе і растлумачце, чаму, з вашага пункту гледжання, менавіта яму ў гэтым горадзе ўстанавілі помнік.

**Крыніца I**

*З артыкула wikipedia «Замкавае будаўніцтва ў Вялікім княстве Літоўскім»*
У XIV стагоддзі стала ясна, што драўляныя замкі недастаткова ўмацаваныя для абароны ад крыжакоў. З гэтага часу ў Вялікім княстве Літоўскім пачынаецца актыўнае будаўніцтва мураваных замкаў.
Адной з асаблівасцей замкавага будаўніцтва ў Вялікім княстве Літоўскім з'яўляецца збудаванне замкаў-кастэляў. Кастэль уяўляе сабой замак рэгулярнай формы з абарончымі сценамі, элементамі якога могуць быць сцены, фланкіруючыя вежы і жылыя пабудовы па перыметры сцен. На тэрыторыі Дзяржавы Тэўтонскага ордэна будаваліся так званыя штаўфенскія кастэлі, якія мелі толькі злёгку выступалыя за перыметр сцен вежы.
Замкі падобнага тыпу, верагодна, будаваліся пры ўдзеле нямецкіх майстроў, запрошаных у Літву вялікім князем Гедымінам...
На падставе таго, што літоўскія касцелі мелі некалькі большы перыметр сцен, чым нямецкія аналагі, мяркуецца, што яны служылі не толькі для размяшчэння гарнізона, але і для абароны мясцовага насельніцтва.
У адрозненне ад Заходняй Еўропы, у Вялікім княстве Літоўскім касцелі практычна не перабудоўваліся і захаваліся ў бліжэйшым да першапачатковага выгляду.

**Крыніца II**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

| | |
|---|---|
|  |  |
| Нясвіжскі замак | Лідскі замак |
|  |  |
| Крэўскі замак | Мірскі замак |

**Крыніца III**



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Адказы:**

1. З Заходняй Еўропы (З тэрыторыі Тэўтонскага ордэна)
2. Кастэль уяўляе сабой замак рэгулярнай формы з абарончымі сценамі, злёгку выступаюць за перыметр сцен вежы. Гэта Лідскі і Крэўскі замкі.
3. Будаваліся на захадзе Беларусі, паколькі мэта - абарона ад крыжакоў, магчымасць для насельніцтва схавацца ад ворагаў за сценамі замкаў, таму і большы перыметр замкаў.
4. Помнік установлены ў Лідзе Гедыміну, таму што будаўніцтва пачалося пры яго праўленні, ён запрашаў майстроў з Еўропы, ён вёў барацьбу з крыжакамі.